# Пункціраm

✔ Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Цэнтральнага батанічнага саду Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з 80-годдзем утварэння ўстановы. "Гэты ўнікальны сад, які мае бясцэнную калекцыю ўзораў айчыннай і сусветнай флоры, з'яўляецца нацыянальным здабыткам", — гаворыцца ў віншаванні.

✔ Беларусь як краіна-ўдзельніца Еўрапейскай культурнай канвенцыі далучылася да інфармацыйнай сістэмы культурнай палітыкі Савета Еўропы "Кампендыум". Адпаведная дамоўленасць падпісана паміж Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Генеральным дырэктаратам па пытаннях дэмакратыі Савета Еўропы. Дамоўленасць вызначае дзеянні беларускага боку і Савета Еўропы па падрыхтоўцы інфармацыі пра стан і развіццё культуры нашай дзяржавы.

✔ Міністр культуры Беларусі Павел Латушка і міністр культуры, мастацтваў і спадчыны Катара Хамады бен Абдэль Азіза аль-Кувары падчас правядзення Дзён культуры Катара ў Беларусі падпісалі праграму культурнага супрацоўніцтва паміж урадамі дзвюх краін на 2011 — 2013 гады. Міністры выказалі надзею на плённае супрацоўніцтва ў сферы культуры і адукацыі.

✔ Беларускі дакументальны фільм "Званар" Кацярыны Махавай атрымаў Гран-пры кінафестывалю ў г. Кошыцэ (Славакія). У конкурсе ўдзельнічалі 20 краін: Германія, Сербія, Беларусь, Вялікабрытанія, Францыя, Латвія, Славакія, Польшча, Венгрыя, Балгарыя, Нідэрланды, Іспанія, Аргенціна, Македонія, Турцыя, Румынія, ЗША, Чэхія, Боснія і Герцагавіна, Харватыя. Міжнароднае журы адзначыла стужку "Званар" як самы выбітны твор фестывалю.

✔ Неігравы фільм "Кавалеры рэк, балот і лясоў" вытворчасці РУП "Беларускі відэацэнтр" стаў пераможцам XVI Міжнароднага экалагічнага кінафэсту "Выратавацъ і захаваць". Кінастужка перамагла ў намінацыі "Аўтарская работа". Аўтарам фільма выступіў беларус Ігар Бышнёў — майстар "экалагічнага" кірунку ў неігравым кіно, эколаг, кандыдат біялагічных навук, беларускі кінарэжысёр-аніматаліст.

✔ У Нацыянальнай бібліятэцы Сербіі ў Бялградзе ў межах святкавання 130-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа адбылася прэзентацыя кнігі "Анталогія беларускай паэзіі" на сербскай мове. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел больш як 200 чалавек, у тым ліку паслы Расіі і Украіны, замежныя дыпламаты, супрацоўнікі Міністэрства замежных спраў Сербіі, прадстаўнікі Парламента Сербіі, сербскай грамадскасці і СМІ. Складальнік "Анталогіі..." — прафесар Белдзяржуніверсітэта Іван Чарота. Перад удзельнікамі прэзентацыі таксама выступілі Пасол Беларусі Уладзімір Чушаў, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Сербіі Дэян Рысціч, перакладчык "Анталогіі..." сербскі прафесар Міадраг Сібінавіч і дырэктар выдавецтва "Сербская літаратура" Драган Лакічавіч.

✔ Удзельнікамі сёлетняга выпускнога балю для студэнтаў — грамадзян замежных дзяржаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце сталі 146 выпускнікоў 14 факультэтаў БДУ. Больш за ўсё дыпломаў сёлета — 94 — атрымалі нядаўнія студэнты эканамічнага факультэта, на другім месцы — Інстытут журналістыкі (13 дыпломаў). З прадстаўнікоў замежных дзяржаў лідзіруюць грамадзяне КНР.

**Падрыхтавала**
**Ярына РЫТАМІНСКАЯ**

Источник:
"Літаратура і мастацтва" - 2012-06-22